3. *Трухан, О.* Діалогізм як визначальна риса в жанровій структурі роману В. Забитко «Невмите небо» та «роману-свідчення» С. Алексієвич «Чорнобильська молитва : хроніка майбутнього» [Електронний ресурс] / О. Трухан. – Режим доступу : // http : www.ellic.pu.if.ua.
4. *Колошук, Н.* Про поетику роману В. Дрозда «Листя землі» / Н. Колошук // Літературознавство. Бібліографія. Інформатика: Доповіді та повідомлення III Міжнародного конгресу україністів. – Харків : Око, 1996. – С. 154–156.

**Т. В. Міхнюк (Мінск)**

## ПРАБЛЕМА ЗЯМЛІ Ў ТВОРАХ Я. КОЛАСА «НОВАЯ ЗЯМЛЯ» І І. МЕЛЕЖА «ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА»

Паэма «Новая зямля» Якуба Коласа – класіка беларускай паэзіі, найвялікшае дасягненне аўтара. Менавіта там знайшлі адлюстраванне старонкі асабістай біяграфіі паэта, выяўлены яго пачуцці, імкненні, ідэалы, спадзяванні. Сам аўтар называў паэму аўтабіяграфічным творам. І гэта сапраўды так. Паэт абапіраўся на рэальныя факты, якія добра ведаў, выкарыстоўваў свае шматгадовыя назіранні за жыццём працоўнага сялянства. Толькі веданне жыцця народа, яго думак і імкненняў забяспечыла магчымасць Я. Коласу стварыць рэалістычны твор, вобразы якога маюць абагульняючае значэнне.

Па маштабнасці тэматыкі і багаццю жыццёвага зместу паэма «Новая зямля» амаль не мае роўных паэм у беларускай літаратуры. Гэта эпічны твор аб лёсе сялянства, аб яго шляхах да волі і шчасця. У паэме аўтар з усіх бакоў адлюстраваў прыроду, жыццё народа, яго працу, побыт, псіхалогію. Таму даследчык творчасці Я. Коласа А. Я. Міхневіч называе паэму «энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX ст.» [1, с. 2].

Галоўныя героі паэмы – простыя сяляне. Яны мараць набыць кавалачак зямлі, пабудаваць хату, жыць, працуючы на сваім надзеле, гадаваць дзяцей. На працягу ўсяго твора галоўныя героі задаюць сабе пытанне: як вызваліцца з-пад панскай улады і здабыць сабе шчасце. Яны жывуць у няволі, церпяць прыгнёт і таму самае дарагое і моцнае іх жаданне – гэта свабода і зямля.

Зямля нібы магнітнае поле, вакол якога групуюцца, да якога цягнуцца ўсе героі абодвух твораў. Іван Мележ выключна глыбока, моцна, ніколькі не ўступаючы ў гэтым плане ні Якубу Коласу, ні Кузьме Чорнаму, развіваючы іхнюю традыцыю, паказаў арганічную, як бы нават стыхійную, сувязь селяніна з зямлёю.

Калі параўнаць герояў твора Якуба Коласа і герояў Івана Мележа, можна сказаць з упэўненасцю, што адзіным сэнсам іх жыцця з’яўляецца зямля. Зямля для Васіля Дзятла – яго жыццё, радасць і гора, светлыя мары і горкія пакуты. Зямля – ён сам. Так жа адносіцца да зямлі і Міхал. «Усе сілы чалавека – у зямлі, – разважае Васіль. – І сіла ўся, і радасць. Няма зямлі – няма, лічы, чалавека» [2, с. 15].

Жыццё Васіля паказана пісьменнікам ва ўсёй складанасці і супярэчлівасці, што вынікае як з асаблівасці яго характару, так і сацыяльна-палітычных абставін. Малюючы вобраз Васіля Дзятла, Іван Мележ псіхалагічна праўдзіва выяўляе дваістасць яго натуры як працаўніка і ўласніка. У душы героя шмат цеплыні, шчырасці, мяккасці, такі ён у сям'і, у адносінах да маці, да Ганны, якую пакахаў на ўсе жыццё, такі ў працы.

У вобразе Васіля вельмі прываблівае яго настойлівасць у дасягненні сваёй мэты. Ён упарты, калі ведае, што гэта выгадна яму асабіста, і смелы.

Аўтар падкрэслівае незвычайную працавітасць Васіля, які зусім не ведае стомы. Хлопец кіруе гаспадаркай, ды не абы як, а, калі так можна сказаць, са смакам: жывёла ў час накормлена і дагледжана, у гумне – парадак. На сенакосе Васіль таксама стараецца з усіх сіл, каб быць не горш за астатніх, загартаваных ў працы мужчын. Гэта любоў да штодзённай працы перадалася Васілю ад бацькоў і дзядоў. Змалку загартоўваючыся ў працы, ён добра ведаў, што жыццё – не вясёлае, бесклапотнае свята, а доўгі і клопатны будзень.

Герой твора не чакае ад жыцця ніякай палёгкі і працуе да горкага поту, да здранцвення рук: «Усё мацней угравала. Пот мачыў цвёрдыя, двух колераў валасы, поўз на лоб, абпалены сонцам, засцілаў вочы, цёк на кволыя, яшчэ амаль дзіцячыя грудзі, прыклейваў да спіны ўшчэнт закарэлую сарочку. Каса станавілася ўсё цяжэйшая. Рукі наліваліся ўтомаю, балелі ў локцях і плячах, слабелі, нагам было млосна. Млосць расплывалася і па ўсім целе. Хацелася сесці. З цягам часу жаданне гэтае не толькі не адыходзіла, а усё мацнела. Сесці, хоць на купіну, хоць у ваду. Пасядзець трохі, адпачыць, а там можна зноў устаць, зноў ісці... Але Васіль не сеў. Ён трываў. Гэта было ўжо не ў навізну – цярпець, адольваць стому, адганяць прывабліўую спакусу пагуляць, паленавацца…» [3, с. 21–22], спадзеючыся, што ўдасца падрамантаваць хату, купіць лепшага каня, адборнага збожжа.

Толькі не пад сілу гэта Васілю, бо на пустой ніве нічога не родзіць, а ўраджаю нават не хапае для сябе. І таму зразумелай становіцца мара Васіля прыдбаць кавалак глушакоўскага поля каля цагельні, дзе з году ў год збіраўся добры ўраджай. Тады – Васіль упэўнены – спраўдзіцца і ўсё астатняе, бо ён ужо даўно засвоіў, што шчырая, да салёнага поту, праца на добрай зямлі – залог дабрабыту. А юнак хоча жыць багата, так, як Корч, а можа і яшчэ багацей. Васіль глядзіць на жыццё глыбей, ён не задумваецца, «куды падацца?», яго хвалюе больш важнае пытанне: «Калі ж ето стане жыць так – што на душы лёгко!..» [4, с. 27].

Гэта жаданне настолькі моцнае, што, не зважаючы на пагрозы Карчоў і новай улады, ён уначы самавольна заворвае поле, а пасля ўступае ў бойку з Яўхімам. Гэты ўчынак Васіля, як і пазнейшая сутычка за зямлю з Міканорам, успрымаецца драматычна, выклікае шчымлівы боль і спачуванне герою.

Нават і ў часы моцнага, чыстага, шчырага кахання Васіль не перастае думаць аб зямлі.

Па свежых слядах праводзім паралель з Міхалам з паэмы «Новая зямля» Я. Коласа. Беззямелле і галеча прымушаюць яго «вандраваць у жыцці: «хадзіў на сплаў ён, на віціны, разоў са два хадзіў у Прусы» [1, с. 12], а пасля

наняўся лесніком да князя Радзівіла. Міхал працуе не шкадуючы сіл, здароўя. Ён ахоўвае лес, даглядае статак, «правіць» сенакосы, «ставіць» рабочых, выконвае шматлікія загады і даручэнні кіраўніка. У працы ён знаходзіць задавальненне, верыць у яе як аснову жыцця і дабрабыту, спадзяецца сваімі рукамі здабыць сваё шчасце. Дзякуючы руплівай і стараннай працы, неаб-жытыя і занядбалыя куткі, у якіх апынаецца герой паэмы, становяцца ўтульнымі і квітнеючымі:

Усё зацвіло, загаманіла,
Бы жыватворная тут сіла
Ад сну прыроду абудзіла [5, с. 17]

Міхал – чалавек клапатлівы, спагадлівы. Ён верны муж і патраба-вальны бацька. Шчыра любячы дзяцей, ён сур'ёзна ставіцца да іх. Наймаючы «дарэктара», Міхал спадзяецца:

А вось мо з меншых што і будзе,
Няхай яны ўжо йдуць у людзі [1, с. 22].

Герой твора паважна адносіцца да брата Антося і разам з ім любіць пажартаваць, павесяліцца, падзяліцца земляробчай мудрасцю.

Працуючы ў Радзівіла, Міхал сутыкаецца з жорсткімі і няўмольнымі законамі, якім трэба падпарадкоўвацца працоўнаму чалавеку. Служба ставіць яго ў поўную залежнасць ад волі пана ляснічага. Спакою Міхал на службе не знае:

То дуб ссякуць, бярозку зваляць...
Або патравяць сенажаці [5, с. 72].

Акрамя догляду за лесам у абавязак Міхала ўваходзіла многае іншае, патрэбнае непасрэдна пану:

То пастуха згадзі, служанку ...
Касцоў наймай і жней... [Там жа, с. 74].

Але і тут ляснічы ўсё роўна знойдзе зачэпку, каб аблаяць. Прыгнёт, знявага, прыніжэнне, лаянка, пагрозы, варожыя адносіны сялян – усё гэта цяжкім грузам кладзецца на душу Міхала. Героя не задавальняюць умовы жыцця і працы, і ён шукае выйсця з цяжкага паднявольнага становішча. Так Міхал разважае:

А дзе ж той выхад? Дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля, зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То – наймацнейшая аснова
І жыцця першая ўмова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць [Там жа, с.76].

Вызваліцца з-пад улады пана, стаць свабодным, на думку Міхала, можна адзіным шляхам набыцця зямлі:

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля – вось што аснова! [Там жа, с. 52]

Думка аб зямлі свяціла Міхалу «зоркай яснай» [1, с. 7] у самыя змрочныя дні, надаючы сэнс яго жыццю. Зямля ва ўяўленні Міхала – «аснова ўсёй айчыне» [Там жа], надзея на вызваленне «з няволі цяжкай, з паланення» [Там жа], «промень волі і свабоды» [Там жа]. Стаць гаспадаром на сваёй зямлі – значыць стаць распарадчыкам свайго лёсу.

Мара Міхала аб зямлі высакародная, узвышаная. Гэта не ўласніцкі разлік (як раней лічылася ў літаратурнай крытыцы), а спроба духоўнага разняволення, самасцвярджэння асобы. Зямля павінна належаць таму, хто на ёй працуе. Галоўны герой хоча быць гаспадаром на сваёй зямлі. І калі б так адбылося, Міхал здабыў бы свабоду, незалежнасць, дабрабыт, адчуў бы асалоду вольнай працы. Але мара аб набыцці зямлі аказалася фантастычнай, ілюзорнай. Міхал памірае, не здзейсніўшы сваю мару набыць зямлю, але перадае свой запавет брату Антосю:

Вядзі ж ты рэй, вядзі... адзін...
Як лепшы брат, як родны сын.
Бог не судзіў мне бачыць волі
І кідаць зерні ў свае ролі...
Зямля... зямля... туды, туды, брат,
Будуй яе... ты дай ёй выгляд...
На новы лад, каб жыць нанова...
Не кідай іх... Га-а-х! – І – гатова! [5, с. 64]

Лёс Міхала з сённяшняга пункту гледжання ўспрымаецца з болем і трывогай. Хворы, абяссілены жыццём, ён памірае, так і не дачакаўшыся жаданай волі. Якуб Колас спачувае Міхалу, паэтызуе яго мару аб свабодзе, аб нязбытнай мары жыцця на сваёй зямлі, яго любові да зямлі. Але паэма «Новая зямля» — не толькі твор аб трагізме лёсу селяніна-бедняка, а таксама аб усім, чым багата і цікава жыццё сялян, аб клопатах і занятках дарослых, аб гульнях дзяцей і іх вучобе, аб святочных днях і буднях.

Бацька паэта (з яго снісаны вобраз Міхала) зямлю ўсё ж такі набыў. Таму аўтар паэмы не лічыў бесперспектыўным шлях набыцця ўласнай зямлі.

Падобная трагедыя з планамі Васіля на зямлю напаткала яго. Праз тры гады ён, ажаніўшыся з нялюбай Пракопавай Маняй, меў гаспадарку, пра якую раней мог толькі марыць: у яго добры конь, будуецца новая хата, «непагана бульба ідзе ля цагельні на палосцы, вытаргаванай у Манінага бацькі» [3, с. 65]. Аднак гэта не прыносіць яму задавальнення. А тут яшчэ ў вёсцы пачаў ствараца калгас. Герой упарта пачынае супраціўляцца. Валоданне ўласнай зямлёй не дазваляе Васілю зразумець, што адбываецца ў жыцці. У гэтым па сутнасці прычына яго драмы. Ён мае ўжо сваё ўяўленне пра шчасце. Аўтарытэт новага жыцця, на яго думку, павінен грунтавацца на матэрыяльным дабрабыце. Аддаць у агульнае карыстанне свайго каня, карову, не дыхаць паветрам стойла, якое яму здаецца прыемнейшым за ўсе пахі на зямлі – гэта не для Васіля. Ён хоча быць упэўнены, што яго жывёла дагледжана, ён, нарэшце, хоча адчуваць, што гэта толькі яго і больш нічыё. Гэта не сквапнасць Васіля, а нармальная псіхалогія ўласніка-селяніна,

сапраўднага гаспадара. Другая справа, што ісці не ў нагу з усімі (хай сабе ўсе астатнія ідуць правільна) – вельмі складана. Так сталася і з Васілём. У сутычцы з Міканорам, прадстаўніком беднага сялянства, які безаглядна прымае ўсё новае і бяздумна імкнецца прывесці ў жыццё, Васіль пераможаны. Пераможаны фізічна, сацыяльна, надламаны маральна. Ён страціў каханне, згубіў зямлю, якая была ягонай запаветнай марай, сэнсам і мэтай існавання. Васіль, які раней адчуваў зямлю, як жывую, самую для яго дарагую істоту, любіў яе, раптам губляе ўсякую павагу да яе.

Гэта быў сацыяльны драматычны канфлікт часу. Колас і Мележ з вышыні сённяшніх дзён, у гістарычнай перспектыве паказалі і сцвердзілі сацыяльную непазбежнасць і заканамернасць падзей выключнага грамадскага значэння. Усебаковы аналіз рэчаіснасці, глыбокае яе чалавечае асэнсаванне вылучылі перад пісьменнікамі на першы план гуманістычны аспект, гуманістычны сэнс грандыёзнага пералому. Ва ўсіх перыпетыях гісторыі, у яе немінучым поступе мастакі слова бачылі перш за ўсё чалавека. Паказваючы гістарычную непазбежнасць падзей, выяўляючы іх грамадскую патрэбу, І. Мележ і Я. Колас у сваіх творах асноўную ўвагу скіроўвалі на чалавечы лёс, бо глыбока разумелі боль, пакуты, адчай і роспач чалавека-селяніна, у якога з зямлёю звязана ўсё жыццё, які без зямлі не бачыў сэнсу і мэты свайго існавання.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Міхневіч, А. Я.* Якуб Колас разважае, радзіць, смяецца... (Выбраныя выслоўі народнага песняра) / А. Я. Міхневіч. – Мінск : БелДІПК, 2002. – 108 с.
2. *Васілевіч, А.* Люблю, хвалююся – жыву : нататкі, эсэ, роздум / А. Васілевіч. – Мінск : Маст. літ., 1986. – 55 с.
3. *Гніламёдаў, У. В.* Ад даўніны да сучаснасці / У. В. Гніламёдаў. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 245 с.
4. *Жураўлёў, В. П.* Адвечная сіла зямлі: Паводле раманаў «Палескай хронікі» Івана Мележа / В. П. Жураўлёў // Роднае слова. – 1999. – № 11. – С. 27–33.
5. *Колас, Я.* Новая зямля: паэма / Я. Колас. – Мінск : Беларусь, 1968. – 400 с.



**С. А. Сігаева (Мінск)**


# ВОБРАЗЫ-АРХЕТЫПЫ АНТЫЧНАЙ МІФАЛОГІІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

Трансфармацыя антычных традыцый, уласцівая перыяду еўрапейскага рамантызму канца XVIII – пачатку XIX ст. арганічна працягвалася і ў пачатку ХХ стагоддзя, у тым ліку, у беларускай паэзіі. Лепшае сведчанне гэтаму – творчасць беларускага паэта Уладзіміра Жылкі.